# УВОДЗІНЫ

## РАЗВІЦЦЁ КУЛЬТУРЫ Ў СЕЛЬСКАЙ МЯСЦОВАСЦІ: ПРЫЯРЫТЭТНЫЯ НАПРАМКІ ДЗЕЙНАСЦІ КЛУБНЫХ УСТАНОЎ

Вырашэнне пытанняў стабільнага развіцця эканомікі, павышэння ўзроўню дабрабыту насельніцтва ў значнай ступені залежыць ад развіцця сельскіх тэрыторый.

Сельскія тэрыторыі з'яўляюцца «стратэгічна важным прасторавым аб'ектам дзяржаўнага рэгулявання, паколькі забяспечваюць выкананне важных народнагаспадарчых функцый»[1], сярод якіх развіццё аграпрамысловай вытворчасці, гарантыя вытворчай бяспекі краіны, узмацненне інтэграцыі Рэспублікі Беларусь у міжнародную эканамічную прастору.

У Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця на перыяд да 2020 г. падкрэсліваецца, што *чалавечы патэнцыял рэгіёнаў з'яўляецца адным з найважнейшых нацыянальных рэсурсаў*[2]. Ад насельніцтва сельскай мясцовасці ў значнай ступені залежыць рашэнне пытанняў эканамічнага дабрабыту, захавання і развіцця нацыянальных традыцый, вуснай народнай творчасці, сферы бытавання і распаўсюджання беларускай мовы, аховы культурнага ландшафту.

У мэтах стварэння ўмоў для прыярытэтнага сацыяльна-эканамічнага развіцця сяла, павышэння эфектыўнасці работы аграпрамысловага комплексу выдадзены Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 1 жніўня 2011 г. № 342 «Аб Дзяржаўнай праграме ўстойлівага развіцця сяла на 2011—2015 гады» (далей — Дзяржаўная праграма), які стаў паслядоўным працягам мер, вызначаных ва Указе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб Дзяржаўнай праграме адраджэння сяла на 2005—2010 гады».

---

[1] Пархоменко, Н. В. Политика устойчивого развития сельских территорий и ее особенности в условиях восточнославянских государств / Н. В. Пархоменко // Менталитет славян и интеграционные процессы : история, современность, перспективы : материалы IX Междунар. науч. конф. (Гомель, 21—22 мая 2015 г.) / М-во образования Респ. Беларусь, ГГТУ им. П. О. Сухого; под общ. ред. В. В. Кириенко. — Гомель, 2015. — С. 12.

[2] Национальная стратегия устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь на период до 2020 г. : утв. Советом Министров Респ. Беларусь, 22 июня 2004 г. / Нац. комиссия по устойчивому развитию Респ. Беларусь; редкол.: Л. М. Александрович [и др.]. — Минск : Юнипак, 2004.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод асноўных пазначаны наступныя ключавыя задачы, якія спрыяюць стварэнню неабходных *умоў для інтэнсіўнага развіцця сельскіх тэрыторый:* умацаванне прэстыжнасці пражывання ў сельскай мясцовасці, павышэнне ўзроўню добраўпарадкаванасці сельскіх населеных пунктаў, у тым ліку аграгарадкоў, забеспячэнне сацыяльнымі стандартамі іх насельніцтва, пераўтварэнне аграгарадкоў у цэнтры высокаэфектыўнай работы сяльчан, павелічэнне дабрабыту сельскага насельніцтва. Пастаўлены мэты пошуку рашэння праблемных сітуацый: надання прывабнасці сельскаму ладу жыцця, паляпшэння дэмаграфічнай сітуацыі ў сельскай мясцовасці, якаснага змянення кадравага патэнцыялу сельскіх тэрыторый, прыцягнення моладзі да працы і пражывання ў сельскай мясцовасці і інш.

Роля аграрнага комплексу была вызначана не толькі як забеспячэнне вытворчасці прадукцыі, але і як *падтрымка і ўзнаўленне многіх важных для грамадства каштоўнасцей, «найперш за ўсё асноў нацыянальнай культуры і самабытнасці народа*, якія далёка не заўсёды можна ацаніць праз паказчыкі кошту і колькасці»[3].

У мэтах развіцця культуры ў сельскай мясцовасці запланаваны мерапрыемствы, якія тычацца:

удасканалення структуры і сеткі сельскіх арганізацый культуры, умацавання іх матэрыяльна-тэхнічнай базы;

адраджэння і далейшай папулярызацыі традыцыйнай культуры, народных промыслаў і рамёстваў;

захавання гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны;

інтэнсіфікацыі культурна-турыстычнай дзейнасці.

Мерапрыемствы сталі часткай агульнай сістэмы па рэалізацыі *мер для эфектыўнага развіцця культуры*, якія прадугледжваюць: арганізацыю дзейнасці аўтаклубаў, бібліобусаў, перасоўных кіна- і відэаўстановак у мэтах абслугоўвання маланаселеных пунктаў, што не маюць стацыянарных арганізацый культуры; паэтапную камп'ютарызацыю дамоў (цэнтраў) культуры аграгарадкоў з падключэннем да іх сеткі інтэрнэт, завяршэнне камп'ютарызацыі бібліятэк аграгарадкоў; стварэнне дамоў рамёстваў або іх філіялаў у мэтах захавання, развіцця нацыянальных і мясцовых звычаяў, абрадаў і фальклору, традыцый народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва; аднаўленне і захаванне аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ў сельскай мясцовасці; арганізацыю на базе дамоў (цэнтраў) культуры філіялаў або пляцовак філарманічнага і тэатральнага абслугоўвання; правядзенне рэспубліканскіх семінараў, фестываляў, спаборніцтваў, конкурсаў і інш.

---

[3] Гусаков, В. Г. Стратегия устойчивого развития сельских территорий / В. Г. Гусаков // Весці Нац. акад. навук Беларусі. Сер. аграр. навук. — 2011. — № 2. — С. 5.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У рамках Дзяржаўнай праграмы Інстытутам культуры Беларусі па заказу Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь праведзены рэспубліканскі агляд-конкурс на лепшую арганізацыю работы клубных устаноў аграгарадкоў «Клуб года» (гл. раздзел IV «Сцэнарна-метадычны комплекс», с. 113).

Мерапрыемствы, праведзеныя ў адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай, у значнай ступені павысілі ўзровень культуры ў сельскай мясцовасці, паўплывалі на паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў культуры, развіццё інфраструктуры сельскіх тэрыторый, спрыялі вырашэнню задачы набліжэння культурнага і сацыяльна-бытавога абслугоўвання сельскага насельніцтва да ўзроўню гарадскога.

Пры гэтым *узмацнілася роля клубаў як устаноў, якія займаюцца арганізацыяй вольнага часу насельніцтва сельскай мясцовасці* ў адпаведнасці з пастаўленымі прад імі задачамі — «падтрымка і развіццё сацыяльна-культурнай актыўнасці і творчага патэнцыялу насельніцтва, фарміраванне культурных запытаў і патрэбнасцей, стварэнне ўмоў для найбольш поўнай самарэалізацыі асобы»[4].

Большую актыўнасць набыў не толькі працэс абнаўлення традыцыйнай мадэлі клуба, але і пошук яго новай, эфектыўнай мадэлі[5].

У структуры сеткі сельскіх устаноў культуры з’явіліся ўстановы новага тыпу — шматфункцыянальныя комплексы, якасна новыя ўстановы, якія сталі вядучымі культурна-інфармацыйнымі цэнтрамі ў сяле.

Створаны клубныя ўстановы новых разнавіднасцей, у тым ліку інтэграваныя, цэнтры (дамы) фальклору, цэнтры вольнага часу і народнай творчасці, клубы-бібліятэкі, клубы-музеі і інш.

Новыя будынкі атрымалі клубныя ўстановы ў многіх аграгарадках.

Разам з тым існуюць **напрамкі клубнай работы, якія патрабуюць удасканалення і развіцця**. Сярод іх:

*дыферэнцыяцыя зместу* культурнай дзейнасці ў сферы вольнага часу;

пашырэнне *змястоўнай* разнастайнасці паслуг;

улік *патрэбнасцей і чаканняў розных груп насельніцтва*;

укараненне *дыферэнцыраванага падыходу* да арганізацыі культурнай дзейнасці ў вольны час;

стварэнне ўмоў для даступнасці паслуг, якія прадастаўляюцца клубнымі ўстановамі, для *усіх сацыяльных слаёў* грамадства;

---

[4] Смаргович, И. Л. Основы культурно-досуговой деятельности : учеб.-метод. пособие / И. Л. Смаргович; Мин-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. — Минск : БГУКИ, 2013. — С. 39.

[5] Гл.: навукова-даследчая работа ДУА «Інстытут культуры Беларусі» «Распрацаваць мадэль сеткі ўстаноў культуры клубнага тыпу і рэкамендацыі па ўдасканаленню метадычнай дзейнасці» (дзяржрэгістрацыя № 20150955; дата рэгістрацыі: 22.06.2015).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*пашырэнне сувязей*, у тым ліку *звязаных з абменам вопытам* (напрыклад, па захаванню і развіццю традыцыйнай культуры, адраджэнню народных промыслаў і рамёстваў), паміж клубнымі ўстановамі розных рэгіёнаў, а таксама наладжванне сумеснай дзейнасці паміж клубнымі ўстановамі і іншымі арганізацыямі (установамі адукацыі, бібліятэкамі, музеямі, навуковымі ўстановамі, грамадскімі арганізацыямі і бізнес-структурамі).

Да ліку **актуальных пытанняў у рабоце клубных устаноў** адносіцца ўкараненне ў іх практыку мерапрыемстваў па рэалізацыі *дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі*.

Асноўнымі напрамкамі яе рэалізацыі ў дзейнасці клубных устаноў з'яўляюцца наступныя:

удасканаленне метадычнага і інфармацыйнага забеспячэння работы з моладдзю;

грамадзянска-патрыятычнае выхаванне, фарміраванне і развіццё духоўна-маральных каштоўнасцей маладога пакалення;

падтрымка і развіццё маладзёжных ініцыятыў;

работа з таленавітай моладдзю.

Вялікую ўвагу ў рабоце з моладдзю клубныя ўстановы павінны надаваць фарміраванню навыкаў здаровага ладу жыцця, прафілактыцы супрацьпраўных паводзін, у тым ліку праз стымуляванне творчай і дзелавой актыўнасці моладзі і падлеткаў як спосаб барацьбы з асацыяльнымі з'явамі, прызнаны найбольш эфектыўным.

Неабходна развіваць актыўныя формы і метады работы, запатрабаваныя ў маладзёжным асяроддзі, улічваць мабільнасць моладзі, яе схільнасць да творчай дзейнасці, патрэбнасці і інтарэсы моладзі, спецыфіку зносін у вольны час[6]; выкарыстоўваць такія формы правядзення мерапрыемстваў, як этнадыскатэка, флэшмоб, тэматычны канцэрт, перасоўная фотавыстава, фестываль маладзёжных субкультур, конкурсна-гульнёвая праграма, анімацыйная праграма, перформанс, дыспут, інфармацыйна-ролевы трэнінг, дыялогавая пляцоўка, тэатралізаваны паказ, скетч, шоу-праграма, конкурс сцэнарных распрацовак і інш.

Клубным установам у працэсе сваёй дзейнасці неабходна звярнуць увагу на актывізацыю работы, накіраванай на *ўмацаванне інстытута сям'і*, захаванне духоўна-маральных традыцый сямейных адносін у сельскай мясцовасці, у тым ліку праз арганізацыю культурна-адукацыйнай дзейнасці.

Даследаванне фактараў дыферэнцыяцыі зместу культурнай дзейнасці ў сферы вольнага часу сведчыць аб тым, што эфектыўнае развіццё сельскіх тэрыторый магчыма толькі ў выніку *комплекснага падыходу*, *у сукупнасці яго культурных*,

---

[6] Кузьмин, А. В. Ценностно-смысловой контекст досугового общения молодежи / А. В. Кузьмин // Вестник Моск. гос. ун-та культуры и ис-в. — 2011. — № 6. — С. 81.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*сацыяльных і эканамічных характарыстык*. У працэсе выканання задач развіцця культуры сельскіх тэрыторый і аграгарадкоў неабходна ўлічваць фактары, якія патрабуюць дадатковага вывучэння:

спецыфіку сельскай ментальнасці ў параўнанні з гарадской;

нарастаючы ўзровень прэтэнзій сельскага насельніцтва;

трансфармацыю жыццёвых асноў у сельскай мясцовасці;

сувязь з вытворчасцю, уласным гаспадараннем на зямлі;

унікальнасць рэгіёнаў і арганічнасць іх функцыянавання ў адзінай сацыякультурнай прасторы.

Асаблівую актуальнасць на сучасным этапе набывае *сацыялогія культуры сельскіх тэрыторый* — вывучэнне патрэбнасцей насельніцтва ў атрыманні пэўных культурных паслуг, вызначэнне функцый устаноў культуры па прадастаўленню гэтых паслуг, аптымізацыя дзейнасці ўстаноў культуры ў адпаведнасці з існуючымі стандартамі, адметнасцю сучаснай сацыяльна-эканамічнай сітуацыі.

Правядзенне і аналіз даследаванняў адкрывае перспектывы для вывучэння стану рэгіянальнага рынку паслуг у сферы вольнага часу з выкарыстаннем магчымасцей рэгіянальнага маркетынгу, выяўлення асноўных спажывецкіх пераваг і матываў паводзін спажыўцоў, распрацоўкі і ўкаранення новых напрамкаў, форм і метадаў работы ўстаноў культуры ў сельскай мясцовасці.

*Лапцёнак І. Б.*,
кандыдат філалагічных навук,
прарэктар па вучэбнай рабоце
ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ